Раман-фэнтэзі з працягам
Працяг. Друкуецца з № 4 2019 г.

*Маргарыта Латышкевіч*

# Век людзей

*(працяг)*

27.

Праз якую гадзіну яны натрапілі на прасёлак, што павольна разгортваўся між пукатых узвышшаў. Над сцяною асінніку падымаліся ў неба дымы з комінаў, пазначаючы яшчэ нябачнае чалавечае жытло, а неўзабаве з-за асінавых пагоркаў вынырнула невялікая вёска на беразе ціхай соннай рэчкі. Трохі вышэй на схіле месцілася сядзіба мясцовага ўладара, а на другім беразе зеўралі вокнамі, як чэрап пустымі вачніцамі, руіны вежаў ды сцен, мабыць, сляды таго колішняга цмокава нападу.

— Тут сапраўды быў цмок? — цікаўна спытаў Вельс, прышпорваючы каня, каб апынуцца наперадзе. Прыўздымаўся ў страмёнах, глядзеў на руіны з-пад далоні заварожана, як на найвялікшы цуд.

— Можа, проста пасля апошняй вайны не адбудаваліся, — мовіла Сташка, трасянуўшы валасамі.

— Вогненны цмок, — нечакана гукнуўся Ясь, падымаючы калматую галаву ад лютні, быццам прахапіўшыся ад сну.— А забіла яго Дзева-Вой на Калінавым мосце.

Ясь, праўда, тут жа зноў даў нырца ў сваю новую песню і не адказваў, як ні тармасіў яго зацікаўлены Вельс. Пан Шчэрба ажывіўся і стаў захоплена прыгадваць тое, што сам памятаў пра Лыцавічы. Памятаў, праўда, няшмат, збольшага пра загады старога князя, Алізарава бацькі, адносна лёсу пагарэльцаў, пра ўзвядзенне буданоў ды вазы з хлебам, пра перасяленне ахвотных і выплаты з княжай казны для сіротаў.

— А цмок-ат, цмок? — захоплена настойваў Вельс.— Які ён быў? З чырвонаю лускай? І хвасцішча даўжэзны? І рогі, быццам карона? І кажановыя крылы?.

— Н-не ведаю, васпане, — Шчэрба таргануў шчакою.— Не бачыў.

Паблізу селішча гасцей хутка заўважылі, і некалькі жвавых падлеткаў, на ляту прытрымліваючы шапкі, сыпанулі вышэй па схіле, цікуючы з-за кустоў, і перагукваючыся, і прысвістваючы.

— Бач ты, якая багатая панна едзе!

— А і гожанькая, у нас такіх яшчэ не было.

— Такая ж гожанькая, як унь той лысы чорт страшны.

Пан Адолік, ён жа лысы чорт, надзьмуваў шчокі, але лаяцца не мог, потны, аслабелы і хваравіта бледны. Адзін з ахоўнікаў князёўны дзеля страху замахнуўся на вісусаў кулаком, каб не дакучалі вяльможнаму пану, і тыя са смешкамі збеглі, зусім схаваўшыся ў зарасніку.

Сядзіба мясцовага ўладара мала чым адрознівалася ад хат у вёсцы, бо, уласна кажучы, і была амаль такою самаю хатай, зрубленай з мясцовага лесу, ужо пацямнелага ад часу і непагадзі, з самым простым чарацяным дахам ды ўтульным дымам з коміна. Адрознівала і паказвала на некаторую заможнасць хіба тое, што гэтая хата была большай па памеры, як бы складзенай з некалькіх. Абкружалі яе незлічоныя прыбудовы, быццам квактуху атачалі піскліўыя кураняты. На вільчаку з лёгкім лязгатам пакручваўся флюгер — чорны вугеркаўскі мядзведзь на страле. Ля варот, нябачны, заходзіўся хрыплым брэхам, з бразгатам цягнучы за сабою ланцуг, сабака.

За хатаю досыць пышна разрастаўся сад, па схіле ніжэй доўга-доўга ішлі дагледжаныя гароды, не надта ўцямным чынам разгароджаныя платамі і плоцікамі. Колькі людзей працавала ля садовых дрэў, то прыводзячы ў парадак жывую агароджу, то ўкрываючы пілавіннем сунічнік. Гасцей заўважылі, ды і, мабыць, нехта з цікаўных падлеткаў прыбег сюды і гукнуў тых, у садзе. Адзін з садоўнікаў, з пышнаю сівою барадой, выйшаў за агароджу, аціраючы рукі аб заношаную світку. Наблізіўся, падслепавата звузіўшы вочы, пакашліваючы ў чорны ад зямлі кулак. Згледзеў урачыстага пана Шчэрбу, пана Адоліка, незадаволенага, як заўжды, а зараз яшчэ і скрыўленага ад болю ў назе, ціхую строгую Амену з маленькім залатым венчыкам у цёмных валасах і, вохнуўшы, паваліўся ніц.

Сівабароды садоўнік у заношанай свіце аказаўся мясцовым уладаром і называўся панам Праксёнам Спорнікам, а валодаў Новымі Лыцавічамі, Малохай ды Вяльнай. Назвы мала што казалі: тутэйшыя мясціны Донай вывучыў не надта добра, куды горш за ваколіцу Ружыцы. Ведаў аднак ад дзядзькі, што ў Парэччы ўладароў ледзь не столькі ж, колькі дробных селішчаў рассыпана па ўзгорках. Так што нават уласнік якога-небудзь закінутага хутара, верагодней за ўсё, мае ўласны герб, радавод, што сягае ледзь не да самога Алелькі Заснавальніка, і гонар, вышэйшы за мясцовыя прыплясканыя вяршыні. І разам з усім гэтым ходзіць у лапцях ды сам апрацоўвае палі, хаця ў Парэччы гэта нікога не дзівіць. Зрэшты, сам заснавальнік роду вугеркаўскіх князёў выйшаў з парэчанскага дробнага ўладарства, што, вядома, нямала суцяшае вяльможных парэчанцаў і праз цэлыя стагоддзі. Хаця суцяшэнне выключна духоўнае, ні табе дукатаў, ні табе ўладарскага ўшанавання.

Пан Праксён з яго трыма вёскамі, мусіць, лічыўся заможным, прынамсі, па парэчанскіх мерках. І, вядома ж, ён не забыўся паведаміць Амене пра сваё з Алелькавічамі сваяцтва цераз стрыечную прабабку і пры згадцы пра гэта нават плечы расправіў, дарма што на тых плячах была падраная світа.

— ...так бы мовіць, адзін корань у нас, светлая мая панна. А што да галін...

Галіны, то бок Спорнікава жонка, дасюль статная і румяная, дачка, дужа падобная да маці, і трое сыноў высыпалі на дарогу, як толькі гаспадар паклікаў іх здушаным і плаксівым ад напружання голасам. Абедзве жанчыны, увабраныя папросту ў пярэстыя сялянскія спадніцы, паглядалі на Амену ў яе сукні з барвовага аксаміту спадылба і няўмела прысядалі. Хлапцы, таксама ў простым і досыць заношаным адзенні, дзічыліся і адступалі ад вяльможных гасцей, збіваліся разам, як спуджаныя авечкі.

Вестка пра кадука ў ягонай ваколіцы Спорніка не столькі напужала, сколькі збянтэжыла, ажно ён азадачана зачасаў патыліцу. А вось просьба прыняць у сябе князевых сваякоў і ўвогуле адабрала мову. Ён толькі нізка кланяўся, лепятаў падзяку за такую высокую княжую ласку і адначасна паспяваў шматзначна міргаць жонцы ды па-змяінаму шыкаць на сыноў-недарэкаў.

Румяная гаспадарская дачка цыкнула на сабаку, Спорнікавы хлапцы адчынілі цяжкія вароты. Па двары хадзілі, асабліва не зважаючы на людзей, шматлікія куры — і белыя, і пярэстыя, і чорныя. Цэлае курынае войска.

— Ну, адкруціліся, здаецца, — не хаваючы задавальнення, заключыў Вельс, калі два ахоўнікі і пан Шчэрба з дапамогаю маладых Спорнікаў з асцярогаю знялі пана Адоліка з каня. Князева свёкра панеслі ў хату за румянаю гаспадыняй пад вохканне, скаргі, лаянку і пагрозы холмецкага ўладара. Тут жа малодшага з сыноў гаспадар сядзібы выправіў на вёску па лекара. Адзін Адолікаў ахоўнік у хуткім часе подбегам вярнуўся, аддуваючыся, і пацягнуў на сабе ў хату куфэркі і вузлы.

— Адкруціліся, — рэхам паўтарыў Донай, абарочваючыся ў сядле на прасёлак, што вёў назад да тракту. Але думалася не пра вяртанне, а пра Ружыцу, ужо незваротна не сваю, і карціла з'ехаць не на месца сустрэчы з Вотанам і Нешкай, не ў Істач, дзе гінулі людзі і дзе ля вытоку Вугеры чакала нешта неадольна страшнае, а туды, у колішні дом, да дуброў і светлых азёр. Ад невясёлых думак ажывалі ля сэрца балючыя ледзяныя іглы, і дзённае святло блякла вакол, і горыч праступала на вуснах.

Цяпер яны апынуліся зусім блізка ад Замка-на-возеры, але шляху да яго не было. Быццам тая, іх з Вельсам Ружыца, дзе жывы быў дзядзька, дзе быў адзіны іх дом, засталася не за пагоркамі, не за палеткамі і пушчамі, не ў ацяжэлай ад снегавых хмар далечыні, але ў сівой ад інею даўніне. І вярнуцца назад скрозь гады, скрозь шалёныя хвалі часу, вядома, аніяк не выпадала: час, як і вялікая Вугера, плыве толькі ў адзін бок.

Амена спешылася са Спорнікавай пачцівай дапамогай, старанна расправіла востры барвовы шлейф. Падняла галаву, бліснуўшы залатым венчыкам, трохі недарэчная на гэтым сціплым падворку. Вецер ласкаваю лапай кратаў яе цёмныя кудзеры, мудрагеліста перавітыя залатымі ніцямі, гуляўся з сабаліным футрам на плячах, з цёплым чорным плашчом ды слізгаў па цяжкім падоле дарожнай сукні.

— Вы ж застанецеся хоць ненадоўга, праўда? — спытала Амена няголасна. — Думаю, вам усім таксама не пашкодзіла б адпачыць, так... васпане?

Ад такога звароту Доная перасмыкнула. Ён абурана скасавурыўся на князёўну, але яе гожы тварык быў вельмі спакойны і непранікальны, і ўся яна — з сарамліва апушчанымі стрэламі веяў, са складзенымі перад сабою рукамі — была ўпрост увасабленнем выхаванасці ды дзявочай сціпласці. «Хітрая зараза», — сярдзіта падумаў Донай.

— Застанемся трохі, чаго ж, ну, — падхапіла і Сташка.— Будучая сястра праўду кажа.

Пад неаслабны перазвон струн ды здушаную лаянку — Ясь напаўголасу сварыўся з лютняй, наракаючы на бязладныя вершы, патрабавальна брахнуў Стаўры. Ганчак, здаецца, пачуў пах смажаніны, што даносіўся з сенцаў, і выказаў сваё стаўленне да заўчаснага ад'езду.

— Нам нельга асабліва затрымлівацца, — мовіў Донай, нібы апраўдваючыся. Амена павяла плячыма і заўважыла з падступнай мяккасцю, што нават легендарнаму Вою-Выратавальніку трэба часам перапыняцца, рубячы пачварам галовы.

— Усім трэба адпачываць, — працягнула яна спакойным і трохі нават павучальным тонам. Пасля, злёгку заружавеўшыся, дадала цішэй: — Нават і... табе.

Вельс сухавата кашлянуў і, у сядле нахіліўшыся да брата, шапнуў, што ніколі не думаў, каб такое прыдарылася калі-кольвек, але ён з вугеркаўскай князёўнаю цалкам, упрост усёю душою згодны.

— Ты ж толькі-толькі пасля лекавання падняўся, — мовіў Вельс з дабрадушнай дакорлівасцю.— Што б на гэта сказаў майстра Дымба, а? Дэкохтаў на цябе няма, доўбня.

«Але ў мяне няма часу адпачываць», — змрочна думаў Донай, кусаючы вусны. У мяне няма права адпачываць, пакуль у Істачы паміраюць людзі, пакуль незваротна гінуць сярэбраныя чары, пакуль глухне патоплены ў чорнай крыві спеў стаячых камянёў. Пакуль той, з інеістым клінком, помсліва напускае на чалавечых сыноў спададжэнні спрадвечнай цемры, прымаючы пачвар за ўласных вылодлівых хартоў.

— Нікога ты не выратуеш, калі сам працягнеш ногі, — сказаў брат, быццам прачытаўшы Донаевы думкі.— Гадзіна-дзве надвор'я не зробяць.

— Вою... Выратавальні... — шумна ахнуў гаспадар, вырачваючы вочы і ажно прысеўшы. Яго дачка, што нерашуча пераміналася на ганку, прыкрыла рот далонькамі. Князёўна паківала,

выхавана прыўзняўшы вуглы вуснаў, і плаўным жэстам, ад якога варухнуліся льсняныя складкі на яе вышываным рукаве, паказала на Доная.

— Вой у барве і золаце! — прадставіла яго Амена ўрачыста, як на замковай плошчы, прычым з самым сур'ёзным выглядам. — Той, што выратуе нас усіх. Той, што пасланы самімі багамі.

Донай горача пачырванеў і не ведаў, куды падзець вочы ад сораму. Вельс пакаціўся ад смеху, а Сташка чмыхнула і трасянула валасамі, абуджаючы сярэбраныя званочкі. Стары Спорнік тут жа сутаргавата раскланяўся, таропка загаварыў, што і думаць не мог, каб у яго сціплую хату з'явіліся такія вялікія… то бок, увогуле шаноўныя госці. І, апроч уласнага неймавернага захаплення, агучыў яшчэ і запрашэнне застацца ды пакаштаваць няхітрых прысмакаў.

— Ад шчырага сэрца! — кляўся пан Праксён, прыціскаючы руку чамусьці да жывата.

— Мы не... — загаварыў быў Донай, але пад дагодлівым паглядам пана Спорніка неяк асёкся і павярнуўся да брата па дапамогу.

Але з сенцаў мацней запахла ежаю, і спакушаны Вельс шумна і перарывіста ўздыхнуў.

— Само сабою, злыдзень, — рахмана сказаў ён. — Нашто ж частавацца нечым смачным і гарачым, — Неба, ды хацця б проста гарачым! — калі можна развесці агонь і зварыць абед дзенебудзь ля дарогі, у сырасці ды брудзе. А то і ўвогуле перахапіць нешта ўсухамятку. Кадукову лапу унь падабраць ды пагрызці, праўда? І ён, Вельс, вядома, не хоча нікога ганіць, але Донай лепей танчыць, чым гатуе, Ясь за сваёй бясконцаю балбатнёй здольны перасаліць нават кіпень і той папаразліваць, а Сташка — аматарка настолькі дзікіх спалучэнняў смакаў, што пасля іх жыць не хочацца, не тое што з пачварамі біцца.

— То нашы народныя стравы, — трохі абражана азвалася Сташка, ваяўніча падбачыўшыся.

— І Навіполе можа з лёгкасцю выйграваць у любым супрацьстаянні, — перакanана заявіў Вельс, — калі стане папярэдне частаваць ворагаў «народнымі стравамі».

— А з дарожных запасаў, калі што, маецца адно сухі хлеб, — дадаў брат, разводзячы рукамі.— І плесня. Проста даводжу да твайго ведама, злыдзень.

Донай паморшчыўся. Апошняе, калі падумаць, была збольшага яго ўласная правіна, але цяжкавата меркаваць пра збіранне харчу ў дарогу, калі чуеш покліч ашалелага Голаду, які імкнецца да безабароннай ахвяры, ды гнілое дыханне Старога Звера.

— Вы застанецеся, — спакойна падагульніла Амена, ужо не пытаючыся, а сцвярджаючы з усёй упэўненасцю, быццам толькі таго і чакала. Пахмурны Донай зноў азірнуўся на прасёлак і падумаў, супакойваючы колкае сумленне, што Вотана, нават калі яны забавяцца тут на пару гадзін дзеля адпачынку, усё роўна выведзе на іх след зачараваны камень.

Пан Спорнік, прыслухоўваючыся, усміхаўся трохі застылай, вымучанай усмешкай і ўздыхнуў з заўважнай палёгкай, калі высветлілася, што шаноўныя госці нікуды не збрыдуць і гасціннасцю не пагрэбуюць. Гаспадар паважна надзьмуў шчокі, выпрастаўся, заклаў далоні за тканы срэбрам шырокі пояс, таропка накручаны тут жа ў сенцах, мяркуючы па ўзоры з кветак верасу і канюшыны, працы парэчанскіх майстроў.

Спорнік запрашаў зайсці, надзіва жвава нахіляючы нехуды стан, і паспяваў за ласкавым мармытаннем, звернутым да гасцей, шыпець на старэйшых сваіх сыноў, што з'явіліся на ганку:

— Кланяйцеся, кланяйцеся, шчанюкі!

Праксёнавы хлапцы, падлеткі з першым пушком над вуснамі, карчакаватыя і здаровыя, як іх бацька, толькі акруглялі вочы, уцягваючы галовы ў плечы, ды моўчкі адступалі. Спорнік, прамінаючы, на хаду ўляпіў бацькоўскую аплявуху бліжэйшаму да сябе сыну, працягваючы ўсміхацца гасцям. Старэйшы Праксёнаў хлапец вынес цяжкі дотык бацькавай рукі раўнадушна, адно пацёр стрыжаную патыліцу, не зводзячы круглых вачэй са Сташыных валасоў.



Раман-фэнтэзі з працягам
Працяг. Друкуецца з № 4 2019 г.

— Званочкі, бач, панавешвала, — баском падзівіўся сярэдні гаспадарскі сын трохі грамчэй, чым варта было б. Яго брат, паважна пашчыпваючы пушок, звузіў вочы і патлумачыў такім жа гучным шэптам, але вычарпальна і без сумневаў: ведзьма. Вельс, пачуўшы гэта, не стрымаў усмешкі.

— Дзіцячымі вуснамі, — мовіў Донаю на вуха, — багі мовяць нам ісціну.

Цесныя сенцы аказаліся прасторнымі і дагледжанымі, застаўленымі гаспадарчымі прыладамі, што падалі ад любога неасцярожнага руху. З гэтых сенцаў трэба было праз адну з дзвярэй выйсці яшчэ ў адны сенцы, а ўжо адтуль, прамінуўшы аддзеленую тонкай сцяною белую печ — агромністую, з пашчай, вартай якога-небудзь невялікага цмока, — можна было трапіць у светлую палову хаты, разгароджаную на асобныя клеці дашчанымі перагародкамі. Гаспадарская сядзіба, аброслая прыбудовамі, была такой жа блытанай унутры, як і дзівацкай звонку: быццам адразу тры ці чатыры вясковыя хаты зрасліся ў адну вялікую пабудову.

У кухні на вялікі стол накрывала, ціхутка напяваючы, сівенькая згорбленая старая. І змоўкла, прыпынілася, блізарука звузіўшы вочы. Над потным лбом, на які наліплі лёгкія пасмы, так і ззяў абшыты блішчынкамі ды каляровымі стужкамі каптур: мабыць, пачула ад Спорнікавай жонкі пра гасцей ды вырашыла ўпрыгожыцца.

— …жончына маці, — неахвотна прадставіў пан Праксён.— Пані Дараніка.

Праксёнава цешча, бухнуўшы на стол мурзаты чыгун, нязграбна прысела, з нязвыкласцю адставіўшы нагу ў грубым чаравіку. І паглядзела на Спорніка добрымі блакітнымі вачыма, вінавата ўсміхнулася, пацягнуўшы круглым носам, як бы пытаючыся: ці добра, ці ладна?

— А вы ж, дзетачкі, сядайце, не стойце, — сказала яна ласкава.— Здарожыліся, нябось, ну то й падсілкавацца не грэх, Усёмаці сведка.

Донай прыўзняў брыво. Трохі дзіўна было чуць згадку пра Ўсёмаці па гэты бок Вугеры: вера ў светлых багоў у Вугерцы мае куды больш прыхільнікаў, і нават некаторыя навіпольцы, асабліва з памежжа, патроху пераймаюць мудрасць мацярок-вайдэлотак, адкідаючы дзедаўскія звычаі. Прынамсі, так падчас сваіх пропаведзяў казала ружыцкая маці-вайдэлотка, старэнькая і сухенькая, як былінка. Яна яшчэ кожны раз даводзіла, што калі ўжо навіпольцы — народ, як вядома, падступны ды хітры — бачаць святло ісціннай веры, дык добрым ружычанам на раду напісана часцей заходзіць у храм, каб ухваліць светлых бостваў. Праўда, не тое каб добрыя ружычане, нават і сам дзядзька, асабліва прыслухоўваліся да гэтых яе парад.

— От дура баба, — абураўся Спорнік, звонка ўдарыўшы сябе па баках.— Боўдзіла навіпольскае! Якія гэта табе дзетачкі? То яе княжая мосць панна Амена!..

І, дзівосным чынам змяніўшы тон, тут жа папрасіў у Амены прабачэння: дурная старая, што з яе ўзяць, з розуму выжыла. Князёўна крывілася, нецярпліва адмахвалася, а Спорнік усё выбачаўся і раз-пораз, надзьмуваючы шчокі, сярдзіта касавурыўся цераз плячо на цешчу, з асуджэннем хітаў галавой. Спорнікава дачка хутка павяла Амену кудысьці ўглыб. Па падлозе пацягнула халадком, бразнулі, скрыпнуўшы, дзверы.

— Дура баба!..— паўтарыў пан Праксён, паварочваючыся да цешчы. Донай нахмурыўся быў, але сама старая на свайго зяця не зважала ці то па звычцы, ці то па глухаце. І так душэўна частавала гасцей, з такім смакам ды імпэтам распавядала, у якім гаршку што ў яе буркоча і само просіцца на зуб, што Донай міжволі ўсміхнуўся і на сэрцы зрабілася лягчэй.

Цяпер можна было спакойна ўмыцца ў халоднай клеці, скінуць і высушыць адсырэлыя плашчы, сагрэцца і пад'есці. Зараз, на лаве ля печы, калі слота ўздыхала за вокнамі, усё гэта падавалася не такой благой задумкай. Пані Дараніка налівала ў гліняныя місы гарачую зацірку, віўся духмяны дымок над залацістымі калдунамі. У печы нешта шыпела, злавалася, марна спрабуючы вырвацца з-пад крышкі, прыцягваючы самую пільную ўвагу ажыўленага Стаўры.

— Добра ў вас тут, — сказаў Ясь напаўголасу. Сядзеў сцішаны, паклаўшы падбароддзе на сплеценыя пальцы, аглядаў скупавата асветлены пакой — ад бэлек з падвешанымі да іх пучкамі духмяных траў да вышыванага ручніка, што вісеў у пустым куце, дзе звычайна ставілі драўляныя фігуркі светлых боствўа.

— А і так, дзетачкі, — адказала яму пані Дараніка.— Жывём сабе паціху, не скардзімся. А вы самі не туташнія, нябось?

— Ружыцкія, — жыва азваўся Вельс.— Унь панна, — ён кіўнуў на Сташку, — аж з Навіполя, а хлопчык, — тут ён звёў бровы, утаропіўшыся ў Яся, і спытаў: — Скуль ты-ат?

Донай пачухаў патыліцу. У Яся неяк атрымлівалася балбатаць пра ўсё на свеце амаль несціхана і пры гэтым амаль нічога не паведаміць пра самога сябе.

— Можна сказаць, — музыка квола ўсміхнуўся, — што і мясцовы... Так, бабця. Так. Хай будзе мясцовы.

Пані Дараніка заміргала добрымі блакітнымі вачыма, пасля, падкульгаўшы бліжэй, ласкава пагладзіла Яся па светлай ўскудлачанай галаве.

— Беднае ты дзіцятка, ай-ёй, — сказала са спачуваннем.— І... не нашае цяпер, так?

— Болей не, — глуха мовіў Ясь. Вельс назіраў за імі дваімі, пытальна ўскінуўшы брыво, але тлумачэнняў так і не дачакаўся. Махнуў рукою і палічыў за лепшае заняцца гарачымі калдунамі.

— …а людзі могуць недагаворваць, калі ім так хочацца, — з набітым ротам сказаў ён, паглядаючы на лютніста.— Дурныя, дурныя людзі.

— Проста я не надта цікавы, — адгукнуўся Ясь.— Ды і няма чаго гаварыць, Лівень.

— Угу, — трохі невыразна пагадзіўся Вельс.— Ну-ну. Я таксама многа хлушу.

Ясь ухмыльнуўся.

— Гэта называецца талентам апавядальніка, — выправіў павучальна.

Утульна патрэсквалі дровы, лагодныя хвалі цеплыні хілілі ў сон і навявалі мляўкія думкі пра Ружыцу. Паўпразрыстыя кольцы цыбулі рассыпаліся пад спрытнымі рукамі пані Даранікі, горкаю скідваліся ў патэльню. У адным з чугуноў тамілася і цяжка ўздыхала, прэючы, капуста, быццам са шкадаваннем згадваючы хуткаплыннае лета.

Ува ўсім гэтым былі свая прыгажосць, свае ўзоры, вышытыя гукамі і пахамі, свая музыка — тонкае паўпразрыстае прадзіва, што цягнулася ды схоплівалася, як бы завязанае на трывалы вузел, на пані Дараніцы. Донай, адклаўшы лыжку, сачыў за кволай згорбленай фігурай уважліва і прыкмячаў вакол яе амаль патухлыя галасы срэбра, як бы рэха заглухлага спеву, здзіўляўся і адначасна зусім не здзіўляўся, быццам ведаў нешта пра яе глыбінным, амаль звярыным чуццём.

— Мілая пані, — вельмі сур’ёзна казаў Вельс Спорнікавай цешчы.— Вам адной з усіх жанчын свету прапанаваў бы свае сэрца і руку. За такія-ат калдуны!..

— …танна, — прамармытала Сташка, закаціўшы вочы. Пані Дараніка, праўда, недачула, а таму ўхапіла апошняе Вельсава слова і адразу ж лагодна заківала, аціраючы зморшчаны лоб хвартуком.

— Ты бяры, дзетачка, яшчэ еш, — гукнула дабрадушна і падсунула Вельсу місу са смятанай.— Зараз у мяне і новыя паспеюць. Ага.

На яе руцэ, агрубелай ад працы і высахлай ад старасці, худой і жылістай, са скурчанымі пальцамі, яшчэ можна было разгледзець звівы зялёнай фарбы, што ўелася глыбока пад скуру.

Зусім як на Сташыных залацістых далонях. Гэтыя ўзоры, праўда, не гучалі — былі пустымі, мёртвымі, і тонкія нітачкі срэбра не цягнуліся ад іх у невымерную далечыню.



— Рагана? — здзіўлена прашаптаў Донай, гадаючы, якім чынам пані Дараніка магла апынуцца тут, у вугеркаўскім Парэччы, без чар і аховы Вялікай. Але сама Сташка, здаецца, нічога не заўважала ці не жадала гэтага бачыць, а таму дазволіла сабе не заўважаць і толькі ленавата, без агеньку спрачалася з Вельсам, што навіпольскія калдуны лепшыя. Хутчэй, мабыць, дзеля ўласна спрэчкі, чым дзеля гонару айчыннай стравы.

— Можа, сапраўды лепшыя, — з набітым ротам пагаджаўся Вельс.— Каб, скажам, забіваць імі людзей…

— Скідваць са сцен падчас асады? — прапанаваў Донай.— Замест смалы і вару?

Вельс зарагатаў і ледзь не падавіўся, так што давялося пляскаць яго па спіне, пакуль брат курчыўся, задыхаючыся і кашляючы.

— Толькі, — прахрыпеў, — не падавай ідэю гэтаму выдумшчыку Тарсу, з яго ж станецца скарыстаць.

— Вы… вы гэта сур'ёзна? — Сташка пакруціла носам, і званочкі ў яе валасах сярдзіта зазвінелі.— Жарты з нашай кухні? Ад ружычан, якія ўсё альбо разварваюць да шэрай кашкі, або недаварваюць? Ха!

— О, — уразіўся Вельс, схапіўшыся за сэрца.— Яна на нас паківае, злыдзень?

— Адназначна, — скрушна паківаў Донай.— На нас і на ружыцкую поліўку.

— Калі ўжо мы згадваем неядомыя рэчы... — Сташка развяла рукамі.

Стаўры, добра падсілкаваўшыся і трохі асавеўшы ад цяпла ды сытасці, разваліўся пад сталом і толькі памахваў хвастом, калі камусь прыдаралася яго незнарок патрывожыць.

— Сабачышча, — насмешліва гаварыў яму Ясь, лёгенька пінаючы. — Ну, які ж ты баявы пёс? Ты ж раскормленая пакаёвая псінка. Пфуй!

Ганчак пакрыўджана фыркаў і, выцягнуўшы касматую шыю, лавіў кінутыя Сташкаю ці Вельсам пад стол прысмакі — не дзеля голаду, а дзеля пацехі. І шумна аблізваў чорны льсняны нос, і папіскваў па-шчанячы, калі Ясь, апусціўшы руку, тузаў яго за вуха.

Пана Адоліка размясцілі ў гаспадарскай спальні, і нават у кухні чуваць было, як князеў цесць, цокаючы і пакашліваючы, лаецца. Князеў цесць, нават хворы, умудраўся раздаваць распараджэнні ды спрачацца са спакойным Шчэрбам.

—…кляты Тарс гэта ўсё круціць, я табе кажу, Анісь! Дарма што сядзіць сабе ў Вугерцы зараз, быццам мыш пад венікам, гэта ж змей, змей атрутны!..

Навіпольскі князь, мяркуючы па ўсім, быў князеву цесцю не надта даспадобы. Алізару, прыгадваў Донай, Тарс не падабаўся таксама і нават, мяркуючы па ўсіх гэтых нарадах ды перапісцы з дзядзькам, выклікаў калі не страх, то занепакоенасць. Донаю Тарс быў хутчэй даспадобы: усмешлівы, бадзёры, ён не глядзеў пагардліва і не баяўся калі што выйсці ў бой разам з уласнымі воямі. Тыя навіпольцы, што біліся з кадуком, стасаваліся са сваім князем папросту, але з павагаю, і заўважна было, што яго любяць.

«То, магчыма,» — думаў Донай, возячы лыжкаю ў настылай зацірцы, — «цалкам магчыма, што менавіта гэтага Алізар з Адолікам і баяцца. Адна справа, калі людзей вакол цябе трымае і гоніць наперад страх ці карысць. І зусім іншая, калі людзі самі ідуць за табою. Ідуць, бо любяць цябе і вераць».

— Чалавечым дзецям трэба ў нешта верыць, — прамармытаў Донай услых, згадваючы Ботанавы колішнія словы, і засяроджана пацёр лоб. Ясь пытальна скасавурыўся на яго, і лютня адклікнулася буйным россыпам гукаў, быццам музыка раскідваў прыгаршчы звонкай вады.

— …а то кажуць яшчэ, — нязмушана мовіў пан Праксён, кашлянуўшы, — што панна Амена за навіпольскага князя згаворана. А?

Ля печы нешта грукнула, ускіпела, палілося, сыходзячы карункавай пенай. Пані Дараніка забразгатала крышкамі.

— Згаворана, як жа, — развязна пацвердзіў Вельс і вываліў на цікаўнага Спорніка цэлы кош замковых плётак, баек ды чутак, перасыпаных жарцікамі і кпінамі. Гаспадар слухаў, прыемна ружавеючы, і ажно павіскваў ад захаплення. А Донай чамусьці зніякавеў, прыгадаўшы той сон з крыніцаю тугі на вяршыні замковай вежы.

З вёскі тым часам вярнуўся Спорнікаў малодшы сын, зусім яшчэ хлопчык, і прывёў майстра лекара, высокага і хударлявага, нечым няўлоўна падобнага да майстра Дымбы з Ружыцы, адно маладзейшага, ды лекарскага вучня. Лекар, пакланіўшыся на хаду ўсім адразу, прайшоў за Спорнікам у гаспадарскую спальню. Яго ж вучань, даўгалыгі падлетак, шчыльна засыпаны рабаціннем, паважна нёс за майстрам лекарскую скрыню. За сценкаю адразу заварушыліся, нешта загрукала. Супакойліва заклекатаў лекар, нешта няголасна прагаварыў Шчэрба, а пан Адолік голасна і злосна крыкнуў:

— Ха-мы!.. Ды ці ведаеце вы, што я? Не смець мне тут…

Ды тут жа завохкаў тоненькім жаласным галаском, як бы і не сваім: балела пану Адоліку не жартам, і Донаю амаль што стала яго шкада. Можа, і стала б шкада, каб пан Адолік быў меней… сабою.

Вакол усё прыйшло ў рух, усё замітусілася. Спорнікава жонка неслася спачатку з умывальным тазам, пасля з палосамі палатна, якія запатрабаваў лекар. Спорнікава дачка, зачырванелая ад стараннасці, прыбегла па гарачы напой ды як хутчэй панеслася назад да Амены. А вось Спорнікавы сыны, зладзеявата аглядаючыся, прамінулі на дыбачках, мусіць, хаваючыся ад бацькі ды лішняга клопату, ухапілі са стала трохі сала ды хлеба і зніклі. Сам Спорнік, знікнуўшы ненадоўга, у хуткім часе ўжо досыць жвава бег, адчыняючы перад Шчэрбам дзверы, і, салодка прымружваючы вочы, казаў штось пра воз ды пра коней, якіх няма патрэбы наймаць у вёсцы. І па ўсім выглядзе ясна было: здзярэ з княжага свёкра за пастой ды ўсе свае клопаты ўпрост неміласэрна.

Адолікавы ахоўнікі, бялявы і лысы, таксама селі падсілкавацца, радуючыся, што князеў цесць пакуль заняты лекарам і не патрабуе іх да сябе. Пасмейваліся з Вельсавых жарцікаў, слухалі, раскрыўшы рты, Ясеў расповед пра Холмеч і тамтэйшага Старога Звера — прыблізна настолькі ж праўдзівы, як усе братавы байкі пра выхаванне ў ваўчыным берлагу. Самі воі дзяліліся чуткамі пра Істач, расказвалі, што стуль з добры тыдзень не было вестак, што кажуць, быццам Замакна-кручы нібыта спрэс вымер, бо ўсіх, нават і Ламцоў, ліхаманка пакасіла.

— Мор, — казаў бялявы, прымхліва асяняючы сябе боскімі знакамі.— Чума, васпане!

— Чума, — паўтараў за таварышам лысы і сплёўваў цераз левае плячо.

Пані Дараніка, зажурыўшыся, сумна хітала сівою галавой. Вельс, страціўшы гумор, трывожна глядзеў на брата цераз стол.«Нельга ехаць«, — быццам гаварыў вачыма. — «Неба, нельга туды ехаць, як бы там ні было. Хіба можна перамагчы паморак адной сваёй упартасцю, злыдзень?..»

— Апошні паморак быў яшчэ за часам Алелькі Заснавальніка, — прамовіў Ясь задуменна.— Старыя песні кажуць, што Дзева-Вой, натхнёная багамі, вынайшла спосаб лекаваць людзей. І, уласна, лекавала. Паспяхова.

— І які ж гэта спосаб? — пахмурна спытаў яго Донай. Ясь усміхнуўся і адказаў, што якраз вось гэтага старыя песні не кажуць. Вельс голасна чмыхнуў: на ягоны розум, тыя доўгія плаксівыя песні ўвогуле нічога спраўнага і праўдзівага ніколі не казалі. Адно прыўкрасныя панны, што вечна б'юцца з пачварамі, ды князі і рыцары, багі тое і сёе, і ўсё страшэнна пераблытана, і ўсе ў рэшце рэшт паміраюць.

— Нуда! — прыпячатаў Вельс, нават па стале кулаком стукнуў. Ясь усміхнуўся:

— Але ж хаця б апошняе з пералічанага праўда, ці не так, Лівень?

Пакуль за сталом размаўлялі пра даўні мор і князя Алельку, прыгадваючы і перабіраючы радкі старых песень, гаспадарская дачка вярнулася з пустым кубкам і, нясмела наблізіўшыся, кранула Доная за рукаў, паклікала ўбок. Густа пачырванеўшы, апусціла вочы і прашаптала, што яе мосць ласкава просіць шаноўнага пана Доная да сябе.

— Няўжо так і сказала?.. — недаверліва ўдакладніў Донай: за кім-кім, а за Аменай такой далікатнасці звычайна не вадзілася, прынамсі, адносна яго сціплай асобы. Гаспадарская дачка нясмела падняла круглыя блакітныя вочы, дужа падобныя да матчыных, слабенька ўсміхнулася і пачырванела яшчэ мацней.

— Сказала, васпане, — выціснула з сябе, паглядаючы трохі вінавата, — што лепей бы вам не змушаць яе прыходзіць сюды самой.

Донай уздыхнуў і стомлена пацёр лоб. Вось гэта было якраз ажно занадта да Алізаравай дачкі падобна.

Князёўна сапраўды чакала яго — у святліцы Спорнікавай дачкі. Прысеўшы на пярыну і абапершыся спінаю на падушкі, чытала маленькую, не большую за далонь кніжачку, абцягнутую блакітным саф'янам. Ля ног яе стаяў умывальны таз ды валяўся нядбайна змяты вышываны ручнік. Па ўсёй святліцы на лавы і доўгі куфар з дзявочым пасагам былі досыць бязладна накіданыя сукні, мабыць, разабраныя гаспадарскаю дачкой. Амена паспела пераапрануцца, напэўна, з той прычыны тут і быў такі гармідар. «Зрэшты, — падумаў Донай, — нядзіўна, што яна сцягнула з сябе тую сукню пры першай магчымасці, мусіць, перапэцкала крывёю забітай беленькай панны».

Колькі пар вастраносых боцікаў стаялі ўпрост на стале — шытыя золатам, срэбрам, выкладзеныя самацветамі ды перлінамі, больш падобныя да дзівацкіх кубкаў, чым да абутку. Донаю слабавата ўяўлялася, як можна проста хадзіць, не падаючы штохвіліны, у такіх. Пахла язмінам, і гэтаму тонкаму, але ўпартаму водару патроху саступілі і кухонныя пахі, і тыя, што жылі тут разам з гаспадыняй: чабор, мята і шыпшына.

— Не спяшаўся, гляджу, — не падымаючы вачэй ад кнігі, дакорліва прагаварыла Амена, калі гаспадарская дачка ўпусціла Доная. І дадала для гаспадыні святліцы кароткае і хвосткае: — Выйдзі.

— Так, ваша мосць, — паспешліва адгукнулася гаспадарская дачка і, нязграбна пакланіўшыся Амене цераз парог, прычыніла за сабою дзверы. Ад гэтага язмін у пакоі зрабіўся мацнейшым, ажно круціла галаву.

— Бачу, васпані палепшала, — мовіў Донай, са шчырым спачуваннем гледзячы гаспадарскай дачцэ ўслед. Амена рэзка, з незадаволенасцю перагарнула старонку.

— Падумаеш, якая шаноўная паненка, — сказала з'едліва.— Калі жадае служыць у князёўнінай світе ды пры сталічным двары, хай вучыцца.

— То, значыць, ты, — Донай недаверліва прызняў брыво, — возьмеш яе ў сваю світу?

— Хай вучыцца, — уніклівa адказала Амена. І дадала, нарэшце адкладваючы кнігу на калені, што за гасціннасць усё-такі плоцяць не толькі сярэбранымі дукатамі. Бацька гэтай дурніцы будзе толькі рады, калі яго дачка стане адной з князёўніных служак: звычайна кампаньёнак Амене падбіраюць з куды больш радавітых і заможных сем'яў. І яны куды болей зграбныя і прыгожыя.

— Хаця, — тут яна пазмрачнела.— Цяпер я не зусім упэўнена, ці… узнагарода гэта.

І ўздыхнула перарывіста, падняўшы плечы, і задрыжала зноў, як тады, на дарозе, калі глядзела, глядзела нерухомымі, як бы невідушчымі вачыма, залітая чужою крывёю. Донай прыгадаў

сваю першую сустрэчу з кадуком, тое адчуванне адчаю і бездапаможнасці, тую бездань, што расхіналася перад ім, што клекатала чарнатою ў пачварнай пашчы. Прыгадаў і не мог не пашкадаваць, і паспрабаваў гаварыць, пераадольваючы супраціўленне слоў, падобнае да пругкай упартасці рачной вады.

— Не… не трэба сябе вінаваціць, — мовіў ціха.— Ты нічога не змагла б зрабіць.

Амена падняла на яго твар.

— Ведаю, — сказала холадна.— Я ніколі не магу нічога зрабіць. Добра, што ты змог. Таму... дзякуй. Як звычайна, прыходзіш і ратуеш. Праўдзівы Вой-Выратавальнік.

Словы сыпаліся з яе, сухаватыя, прыпалыя палыновай горыччу, быццам ляжалі, як адкладзенае да лепшых часоў адзенне, у куфры, перасыпаныя каліўцамі сухой травы.

— Мне, — прагаварыў Донай, пахмурнеючы.— Мне не падабаецца, калі мяне так…

Князёўна паглядзела без з'едлівасці і насмешкі, проста здзіўлена.

— Але Донай жа і ёсць Вой-Выратавальнік, — мовіла трохі разгублена. Яна, можа, сумнявалася раней, калі ўсе вакол пераказвалі дзікія показкі пра кадукова сэрца ды цмокава джала, але цяпер сумнявацца, значыць, адмаўляць відавочнае.

— Быццам у рамане, да душы, — яна паклала далонь на блакітную кніжачку ў сябе на каленях.— Рыцар, што з'яўляецца ў час патрэбы, усіх ратуе і забівае пачвару.

Донай цяжка ўздыхнуў.

— Ён не забіваў пачвару ў адзіночку, — выправіў ён трохі раздражнёна.— Ніводнага разу, заўжды з дапамогаю іншых. Ён не еў кадукова сэрца і не… што ён там нібыта мусіў рабіць з тым цмокавым джалам?..

— І гэта не рыцарскі раман, князёўна, — мовіў Донай з горыччу.— Таму што я... я не магу ўратаваць усіх. Як бы ні хацеў і як бы ні стараўся.

— Уратаваць усіх, — паўтарыла за ім Амена і зноў пазмрачнела і сцялася, зноў задрыжала. Донаю стала яе да болю шкада, а шкадаванне міжволі пацягнула за сабою дрогкую нітачку думак, як за іголкаю цягнецца шаўковая ніць.

Чужая віна перамешвалася з неспакоем і сумам, з самотаю і страхам — неадольным, сцюдзёным, што скоўваў усё цела, што адбіраў мову. А за бояззю былі слёзы, многа-многа, цэлая рака, вялікая, як Вугера.

Плакала дзяўчынка над драўляным цмокам, у якога адляцела колка, плакала панна на версе замковай вежы, то гэтаксама будзе плакаць і вяльможная пані на вежы іншага, чужога, далёкага замка. Нітачка ў руках адвечнай пралі прапіталася соллю, і праля шэпча, што ва ўсіх сваё прызначэнне. У кагосьці —залатое кола вянца і барвовы след на сухой траве, у кагосьці — кола чароўных знакаў на скуры ды покліч бразготак. А ў кагосьці — кола слёз, кола з салёнай вады, быццам ніколі не бачанае мора, нібы вугеркаўскія чайкі прынеслі драбочкі яго на крылах, нібы з хмар пакаціліся цяжкія, як перліны, кроплі, пасыпаліся на аксамітны падол.

Ацяжэлая, гарачая ніць уздыхнула — і хвілінная повязь перарвалася, бліснуўшы срэбрам. Тварык Амены пабялеў і выцягнуўся, сама яна павольна паднялася, безуважна ўпусціўшы свой раман на падлогу. Не зводзячы з Доная вачэй, хмурылася, крывячы вусны, быццам не рашалася сказаць нешта ўслых. Быццам прыгадвала, быццам, ці можа такое быць, таксама бачыла той дзіўны сон. Сон, у якім Донай быў сонечным промнем, што вольна блукаў па Вугерцы, што незнарок завітаў у князёўніну вежу.

— Лухта гэта ўсё, праўда, — з сэрцам прагаварыў Донай, падымаючы кнігу і працягваючы яе гаспадыні.— Воі, Выратавальнікі. Я... я проста раблю, што павінен. Што магу. Толькі і ўсяго.

Амена здзіўлена прыўзняла бровы, прыняла ад яго томік і раптам усміхнулася. Тут жа паружавела, кашлянула, старанна хаваючы ўсмешку, і загаварыла ўпэўнена, так, быццам зараней некалькі разоў пракручвала ўсю гэтую размову ў галаве. Донай мусіць ведаць, што за нападам на абоз ды за галаварэзамі ў замку сапраўды, відаць па ўсім, стаіць яе дзед. Гэта напэўна: яна адшукала некаторыя лісты ды мела пару патрэбных размоў. Аднак усё гэта, калі што, зусім не дзеля асабістай непрыязні да іх з братам. Ну, ці не толькі дзеля гэтай непрыязні.

— Супакоіла, — азваўся Донай змрочна.

— Ён хацеў бы развязаць бойку з Навіполем, — патлумачыла яна занадта спакойна для таго, хто кажа пра распальванне войн. І, нявесела ўсміхнуўшыся, заўважыла, што, калі б сёння яны з дзедам загінулі ля мяжы з Навіполем, гэта якраз магло б падштурхнуць бацьку парушыць перамір'е.

— То... твой бацька, значыць, пра ўсё гэта ведаў? — спытаў Донай заклапочана. Князёўна паціснула плячыма, паварочваючы блакітны томік у пальцах.

— Цяжка меркаваць, — адказала няўпэўнена. Бацька ўсё-такі не дурны і дакладна не даваў ніякіх прамых распараджэнняў. А калі і ўмоўна пагадзіўся на той напад у Парэччы, то наўрад ці ведаў ці хацеў бы ведаць, хто менавіта суправаджае зброю з Кудравіц замест дзядзькі Тамаша. Патрэбныя былі разменныя фігуры. Нагода, зачэпка, разумееш? Але... зараз ахвяраваць табою занадта дорага, магу цябе запэўніць.

І заўважыла, гледзячы ўбок, што ў той жа час за жыццё Донаева дурнога брата яна аніяк паручыцца не можа, асабліва калі ён па-ранейшаму будзе раскрываць свой рот у самы недарэчны час:

— Пры княжым двары трэба ўсё-такі не толькі ўмець гаварыць, але і ўмець маўчаць.

— Лепей тады проста не быць пры двары, — сярдзіта адказаў Донай. Амена няпэўна пахітала галавой і прыціхла, зноў круцячы ў руках сваю кніжачку ў пазалочаным пераплёце. На блакітным саф'яне Донай, да свайго здзіўлення, прачытаў выведзенае залатымі літарамі «Балада пра Вагнякрылаву пагібель» і перарывіста ўздыхнуў. Напэўна, нехта дужа прадпрымальны ў Вугерцы паспеў запісаць ад кагосьці няхітрыя словы ды выдаць кніжкі на продаж.

Ясева недарэчная песня прымудралася даганяць яго паўсюль, бы які ўчэпісты хорт.

— І... і вось яшчэ што, — зноў загаварыла князёўна, з напружанай складачкай між цёмных броваў. — Тая спроба атручання ў Холмечы, пра якую ты казаў. Я не знайшла аніякіх пацверджанняў, што Адолік спрычыніўся і да гэтага. А я… шукала.

— То бок гербавы пярсцёнак не пацверджанне? — непаразумела спытаў Донай, пачухаўшы патыліцу. Князёўна ціхенька засмяялася і патлумачыла: дзякаваць багам, яе дзед, як і бацька, таксама не дурны, таму загадаў бы выканаўцам найперш пазбавіцца любых улік. У тым ліку гербаў на даспехах, пярсцёнкаў з мядзведзем і падобнага. Як, зрэшты, ён і зрабіў раней, скажам, падчас нападу на абоз са зброяй.

— У Холмечы быў... нехта яшчэ, — пераканана сцвердзіла князёўна.— І гэты нехта, вядома, не атруціць цябе хацеў, а усяго толькі кінуць цень на Вугерку. Прымусіць цябе не давяраць майму бацьку. Цяміш, не?

Донай прыўзняў брыво, прыгадваючы холмецкага карчмара ды той кубак з атрутаю. Вось і Вельс, здаецца, таксама меркаваў пра двух розных людзей, што дзейнічалі як бы супраць адзін аднаго. Брат меў рацыю, прынамсі, у адным: самому Донаю цяжка было ўявіць, што нехта можа задумваць падобнае за яго спінаю — да млосці, да галаўнога болю цяжка. «Вельс правільна сказаў», — змрочна падумаў Донай, пачуваючы сябе так, быццам на яго вылілі вядро



бруду. Напэўна, ён, Донай, праўда дальназоркі. Але, трасца іх усіх вазьмі, такога і бачыць не хочацца, не тое што разумець.

— Тарс, — прагаварыла Амена, памаўчаўшы, быццам чакала нейкіх слоў ад Доная і не дачакалася,— вельмі хоча займець Воя-Выратавальніка на сваім баку. Ясна, не?..

— Занадта… ясна, — адказаў Донай з горыччу.

— Усім патрэбны Выратавальнік, — сказала Амена, вывучаючы яго твар.— Каб забіваў кадукоў, каб стаў апірышчам трону. Ці… каб рамантаваў цацачных цмокаў.

— Нешта не помню, каб займаўся рамонтам цацак, — хмурна адказаў Донай. Князёўна крывенька ўсміхнулася і павольна адышла да акна, рассеяна пакручваючы ў руках кніжку, пацягнула за сабой чорны шлейф.

— Яе будучы муж, — няголасна загаварыла Амена, — не пазбаўлены ані клёку, ані спрыту, ані пэўнай абаяльнасці. Таму кеміць, што той уладар, на чыім баку Выратавальнік, пасланец светлых багоў, заўжды будзе мець народную падтрымку ды любоў. Таму і сам заехаў у Вугерку урачыста, у залатым вянцы ды барвовым плашчы, каб гарадскія плеткары трубілі па ўсіх завулках пра боскую волю ды старыя песні, пра даўнія прароцтвы, што нарэшце спраўджваюцца. Таму кінуў гэтыя свае гульні ў пераапрананне, калі Доная назвалі Выратавальнікам за справы. Таму, адчуўшы разлад між Алізарам і Донаем, не мог не паспрабаваць падкінуць у гэты агонь уласных паленцаў.

Войны ўсё-такі можна выйграць не толькі мячамі ды бойкамі на мяжы, а народная любоў ці народны гнеў таксама могуць быць зброяй, вядома, ва ўмелых руках.

— …і я магу зразумець, — Амена, не паварочваючыся, павольна паківала, — чаму бацька так асцерагаецца яго, а дзед лепей згодны быў прадаць мяне Ламцам за дукаты на войска, чым аддаваць яму. О, я магу яго зразумець.

Гаварыла так, быццам Тарс — нейкая пачвара, на манер кадука. Пачвара, якой не ўнікнуць, не пазбегнуць, але якою дзеля дзікай магутнасці нельга не захапляцца. Дзядзька, паляўнічы-заўзятар, так гаварыў пра хітрых старых секачоў, здольных абдурыць усіх яго загоншчыкаў, а каторага з егераў нават пакалечыць.

— Але ж ты не тавар! — сярдзіта адгукнуўся Донай. Усе гэтыя прыдворныя хітраспляценні абрыдлі яму да смерці: жывыя людзі як разменныя фігуры, подкупы, падлогі, падман на кожным кроку, маскі прыязні, продаж уласных дзяцей і абмен дачок на непарушнасць межаў княства. Дзе не хопіць дукатаў, там прыплоцяць крывёю, дзе і гэтага мала, можна прыкласці ўласнае дзіця, каб разлічыцца, каб купіць яшчэ зброі, каб праліць яшчэ болей крыві.«Толькі сваркі і звадкі, — шапнуў над вухам Вельсаў голас, — вечная няспынная грызня». Войны — за быдла, за золата, за ўладу, бо ні таго, ні другога, ні трэцяга вечна не стае, бо заўжды трэба толькі болей, болей і болей.

Лаянка, мудрагелістая, на дзядзькаў манер, амаль сарвалася з Донаевых вуснаў, але ў апошні момант ён скасавурыўся на князёўну і стрымаўся, адно сціснуў кулакі. І толькі спадзяваўся, што і Алізару, і Тарсу, і нават хвораму пану Адоліку зараз ікнулася.

— …але ж мяне прадаюць, — раўнадушна сказала Амена.— Таму, можа, трэба радавацца, што мой шлюб прынясе мір і шчасце тым незнаёмым людзям у памежных вёсках і мястэчках.

Прагучала, праўда, не дужа радасна, але і без асаблівай скрухі — шэранька, абыякава. Яна іх не ведае, зразумеў Донай з нечаканай і вусцішнай яснасцю. Тых, што працягвалі рукі на плошчы, молячы аб дапамозе, тых, што прасілі, падбягаючы да яго ў замку, за родных і любых. Тых, што баяцца, галеюць і галадаюць, выдумваючы сабе віцязяў, бо калі верыш, лягчэй. Яна іх

Раман-фэнтэзі. Працягам. Працяг. Друкуецца з № 4 2019 г.

не ведае, не ўяўляе нават, якія яны, як жывуць, як пакутуюць і як вераць, і таму зусім не можа зразумець, наколькі гэты мір важны для іх усіх, колькі нявінных жыццяў атрымаецца зберагчы, калі пазбегнуць вайны ў Парэччы.

Ён прыгадаў сваю Ружыцу — такую жывую і такую вечна любую, якая складалася з безлічы людзей, не самых лепшых, часам і нядобрых, але ўсё роўна блізкіх, родных. Згадаў — і быццам апякло знутры, і нельга было не загаварыць.

Пра ўсіх гэтых смяшлівых служак, і дзядзькавых зухаватых егераў, і румяных кухарак, і дабрадушных конюхаў, і балбатлівых садоўнікаў. Пра ўсіх слабадчан, аматараў кірмашовых забаў ды боек сценка на сценку, пастухоў з Радастава, піваварaў з Дундароў, мянцоўскіх сілачоў, што хадзілі на ваўкоў адно з дубцамі, заборцеўскіх слынных знахараў. Пра лесасекаў з Холмечы, вяскоўцаў з навіпольскага памежжа, гандляроў, паважных горцаў з доўгімі косамі. Пра ўсіх тых, каго б закранула вайна, незалежна ад яе сыходу, бо просты люд пакутуе пры любым раскладзе.

— ...і ты дапамагаеш, — мовіў Донай трохі асіплым ад гаварэння голасам.— Ты ратуеш іх. Праўда. Без усякіх там мячоў, без патрэбы забіваць. То хто тут Выратавальнік?

Амена глядзела на яго вельмі ўважліва, утаропіўшыся сур'ёзнымі карымі вачыма, быццам бачыла ўпершыню, і, што самае дзіўнае, маўчала. Донаю тут жа зрабілася неймаверна няёмка за сваё нечаканае ды, верагодна, досыць смешнае красамоўства. «У Вельса, — падумаў ён, — у Вельса б, канечне, атрымалася сказаць усё гэта куды лепей і пераканаць, і падбадзёрыць, і натхніць».

— Любіш ты… сваю Ружыцу, — сказала Амена, мякка ўсміхнуўшыся. І, кашлянуўшы, адвяла пагляд, вельмі старанна стала ўладкоўваць блакітны томік рамана на стосе дарагіх сукняў.

— Гэта ж наш дом, — Донай паціснуў плячыма. І спахапіўся, і паспешліва выправіўся: — Гэта... быў наш дом.

Кожны раз, калі ён вымаўляў гэта ўслых, быццам услых адмаўляўся, выракаўся, падавалася, нібы Ружыца адыходзіла далей і далей, укрытаю туманнаю дымкай памяці.

— А што, уласна, змянілася? — князёўна ганарліва ўскінула падбароддзе.— Не тое каб нехта забараняў табе туды вяртацца ці… нешта падобнае. Я вось, скажам, дакладна не забараняла, а Ружыца зараз маё ўладанне.

— Але князь... — нерашуча пачаў Донай, аднак Амена нецярпліва адмахнулася.

— Бацька сам падарыў мне Ружыцу, — мовіла з выклікам, скрыжаваўшы на грудзях рукі.— Так што ані яму, ані дзеду, ані тым больш Тарсу слова не давалі.

Донай ледзьве стрымаў смяшок: князёўніны замашкі падаваліся досыць прыдатнымі для гаспадыні заможнага ўладання кшталту Ружыцы. Да таго ж, паводле княжага статута аб уладаннях, Замак-на-возеры павінен быў застацца ў адзінаасобнай Аменінай уласнасці і пасля вяселля — Аменін муж на Ружыцу права не меў. Хаця Тарса найперш цікавіў менавіта парэчанскі пасаг, так што наўрад ці навіпольскага князя гэта засмуціла б.

Ды і Ружыца, у рэшце рэшт, дакладна будзе спадчынай кагосьці з іх з Аменаю дзяцей, таму разумнік Навіполец аказваўся ў выйгрышы пры любым раскладзе. Таго, пэўна, і дамагаўся.

— То... словам, вяртайся дамоў, — сказала Амена, агладзіўшы на сабе сукню.— Калі, вядома, захочаш. Я... не загадваю. Як не хочаш, ну і не...

«Проста вярнуцца дамоў», — падумаў Донай, ускудлачыўшы валасы. — «Толькі і ўсяго». Незалежна ад князёў, незалежна ад магутных княжых дарадцаў, незалежна ад напышлівых прыдворных у Алізаравым замку. Княжы двор у сталіцы, з усімі шэпцікамі за спінай ды саладжавымі ўсмешкамі, з калючымі позіркамі, што сочаць з усіх бакоў, з гэтай гульнёй у таўлеі з жывымі



людзьмі замест фігур... княжы двор дакладна быў не для яго. Не тое каб плётак і шэптаў нават і ў Ружыцы было меней, вядома.

Зрэшты, апошнім часам падавалася, што цяпер нідзе не заставалася месца для іх з братам — месца, куды можна было б вярнуцца, якое можна было б назваць калі не домам, дык хоць прытулкам. Вельс, канечне, яшчэ колькі месяцаў таму загаворваў пра іх далейшы лёс ды магчымы сыход з Ружыцы, але наўрад ці ён, па ўласнай волі пачынаючы такую гаворку, добра ўяўляў сабе, куды іменна яны маглі б сысці. Ад гэтай нявызначанасці, няўпэўненасці, амаль сірочай непрыкаянасці расцякалася ўнутры вусцішная пустка. Толькі што былі карані, сувязі, цёплыя ніці, якія цягнуцца і надзейна прывязваюць сэрца, быццам якар, да нечага важнага, — і падсеклі іх, і вырвалі бязлітасна.

Пра тое, што здарыцца пасля Істачы, Донай нават і не думаў, не дазваляў сабе задумвацца, бо сумняваўся, ці будзе ўвогуле нейкае «пасля». Дасюль у сутычках з пачварамі яму шчасціла — і яму дапамагалі. Але, і гэта Донай ведаў цвёрда, удача не можа доўжыцца вечна.

Княжыч кургановага люду ад сваёй задумы не адступіцца, а ён будзе страшнейшы за якую пачвару. І тая атрутная асуджанасць, што жыла ў ім, перакотваючыся пад скурай, тое напружанае прадачуванне ледзянога болю ад удару клінка пад рэбры, смак уласнай крыві на вуснах, чарната на снезе — усё гэта халадзіла і абцяжарвала сэрца, усё гэта вынішчала кволыя парасткі спадзявання. «*Хіба можна змагацца з тым, хто нясе інеісты клінок*», — шапталі скрушныя сярэбраныя галасы. Яго ледзяная воля спавівае, скоўвае, як кайданы, цягне сілу, адбірае дыханне. Ён — сама Смерць, увабраная ў хаўтурную снежную бель, ён — Мор, што язвамі караскаецца па абяссіленых целах, ён — крыкі воранаў над кінутымі мёртвымі, ён — скавытанне і лютыя скокі завеі, ён — белыя косткі, рассеяныя па палях, быццам жыта, ды такое насенне ніколі не зарунее з-пад снегу.

— Я... хацеў бы, — адказаў Донай князёўне і адначасна самому сабе, агучваючы тое, пра што апошнім часам не дазваляў сабе марыць.— В-вярнуцца. Калі б толькі…

У дзверы пагрукалі: то Спорнікава дачка, зноў няўмела прысеўшы перад князёўнай, паведаміла паўшэптам, што яе мосць чакае яго мосць, і яго мосць прасіў яе мосць, каб яе мосць… Як бедная румяная панна ні блыталася ў бясконцых мосцях, усё-такі стала зразумела, што Амену кліча да сябе пан Адолік і што князеў цесць, як звычайна, не ў самым лепшым гуморы.

— Спадзяюся... — прагаварыў Донай змушана, калі яны з Аменаю разам выйшлі ў халодныя сенцы. — Спадзяюся, пан князеў цесць хутка паправіцца.

Прагаварыў і сарамліва кашлянуў, бо асаблівай спагады да Алізарава вяльможнага сваяка, як ні намагаўся, не мог у сабе вышукаць.

— Я... таксама, — няголасна азвалася князёўна.— Характар у старога паскудны, і мы сваримся разоў па дваццаць на дзень, але… ён жа мой дзед. Які б ні быў.

І прагаварыла раптам з нечаканаю цеплынёй, што тады, на дарозе, дзед увесь час казаў ёй, каб сыходзіла, каб кінула яго і ўцякала сама, пакуль пачвара занята воямі.

— Вось жа дурань стары!..— буркліва прагаварыла Амена. Голас яе задрыжаў, і белая хустачка мільганула ля самых вачэй і адразу ж схавалася.

— …сказаў, што ніякіх паскудных дэкохтаў, ты — хам і сын хама! — раз'юшана грымнула за дашчанаю перагародкай. Са смачным усхліпам разбілася нешта шкляное, дабрадушны мужчынскі голас заквахтаў штосьці супакойліва і тут жа войкнуў.

— Васпане, зусім не варта так непако...

— Ха-мы! Цябе Навіполец сюды падаслаў, а ну прызнавайся, сабачая кроў!..

Донай кашлянуў. Амена ўздыхнула.

— Апошнім часам стары паўсюль вышуквае шпіёнаў, — мовіла ціха.— Лепш пайду, пакуль ён беднаму лекару галаву не разбіў. Бывалі... выпадкі.

І, ужо ўзяўшыся за клямку, павярнула галаву ды цераз плячо, з-за хваляў цёмных кудзераў кінула паўпросьбаю:

— Вяртайся дамоў, Вагнякрылава Пагібель. Калі... калі ласка.

Таропка сышла, прашаргацеўшы сукняй, толькі бліснула з пакою святлом ды рыпнулі і акуратна, без груку прычыніліся дзверы.

А яе паўзапрашэнне-паўпросьба засталася, і вакол усё яшчэ тонка патыхала язмінам.

*Працяг будзе.*

*Ілюстрацыі: Бестрамвайнасць*